*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 КРАСАВІКА 2008 г. ПЯТНІЦА № 69 (26182)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**Прамыя лініі**

**ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТЭАПАРОЗ І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА?**

Якія метады прафілактыкі і лячэння хваробы ёсць сёння? Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць падчас «прамой лініі» **загадчыцы кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Аляксееўне ВАСІЛЬЕВАЙ.** *«Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ з 15.00 да 16.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.*

**ЗАБЫТАЕ? НОВАЕ? ВЕЧНАЕ!**

На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый, адкажуць нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ. «Прамая лінія» пройдзе 24 красавіка з 15.30 да 17.00. Тэлефануйце ў рэдакцыю па нумарах: 292 38 92; 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03)**

## Беларуская медыцына павінна вырашаць задачы сусветнага ўзроўню

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з урачамі, якія выканалі першую ў Беларусі аперацыю па трансплантацыі печані.**

На думку Прэзідэнта, з гэтай мэтай трэба хутчэй адкрываць рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр транспланталогіі на базе 9-й клінічнай бальніцы Мінска. «Калі мы ў бліжэйшы час яго не адкрыем, то можам адстаць і потым ужо не наверстаем упушчаны час. Калі могуць людзі на такім узроўні працаваць, трэба даць ім магчымасць. Галоўнае — захаваць існуючы патэнцыял, высокакваліфікаваных спецыялістаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Цэнтр забяспечыць канцэнтрацыю на рэспубліканскім узроўні ўнікальнага абсталявання, высокакваліфікаваных медыцынскіх кадраў, падрыхтаваных у лепшых клініках Еўропы, створыць спрыяльныя ўмовы для развіцця медыцынскай навукі ў Беларусі. Укараненне ў практыку аховы здароўя тэхналогій асабліва складаных хірургічных умяшанняў, аперацый па трансплантацыі органаў і тканак дасць магчымасць таксама выключыць накіраванні грамадзян на лячэнне за мяжу.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, трансплантацыяй органаў і тканак неабходна займацца ў больш шырокім маштабе. «Трэба ставіць такія задачы, якія ставяцца ў свеце. Калі правядзенне ў Беларусі адзінкавых аперацый па трансплантацыі печані і невялікае дасягненне ў сусветным маштабе, трэба мець на ўвазе, што заўтра гэта будуць тысячы аперацый», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што цэнтр, які ствараецца, неабходна аснашчаць абсталяваннем самага высокага ўзроўню.

Здароўе людзей з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў рэспубліцы робіцца ўсё магчымае для таго, каб узняць на новы ўзровень медыцыну, ахову здароўя. «Такія маштабныя ўліванні ў гэту сферу, як у нас, не праводзіліся і не праводзяцца нідзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што сёння ў Беларусі вядзецца маштабная работа па поўным пераснашчэнні ўсіх бальніц — ад раённага ўзроўню да рэспубліканскага. Ён папярэдзіў, што ні ў адной з мадэрнізуемых бальніц, цэнтраў не павінна быць дапушчана разгільдзяйства як у плане рамонту, так і ў плане закупкі сучаснага абсталявання. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што важнай задачай з'яўляецца забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў урачоў, якія выканалі ўнікальную аперацыю па трансплантацыі печані, з яе паспяховым правядзеннем. Ён адзначыў, што гэты поспех важкі і значны яшчэ і таму, што 2008 год аб'яўлены ў рэспубліцы Годам здароўя. «Тое, што вы зрабілі — перамога айчыннай медыцыны. Для нас важна, каб падобныя аперацыі былі не адзінкавыя, а рабілася іх як мага больш», — падкрэсліў Прэзідэнт. Пры гэтым, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у гэтай сферы не павінны дапускацца розныя злоўжыванні і злачынствы.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## Веснавая палявая кампанія будзе прафінансавана ў поўным аб'ёме

**Аб гэтым далажыў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.**

На закупку ўгнаенняў, гаруча-змазачных матэрыялаў, набыццё новай сельгастэхнікі, рамонт і аднаўленне існуючага абсталявання і іншыя мэты будзе накіравана Br2170 млрд.

Аляксандр Лукашэнка даручыў на працягу бліжэйшага тыдня паскорыць тэмпы правядзення пасяўной кампаніі, каб завяршыць яе ў сціслыя тэрміны. На гэты час у краіне яравыя культуры пасеяны больш як на 20 працэнтах запланаваных плошчаў, падрыхтавана глебы пад яравую сяўбу на ўзроўні 30 працэнтаў да плана. Прэзідэнтам пастаўлена задача атрымаць не менш як 7,8 млн тон збожжа, не менш як 150 тыс. тон піваварнага ячменю, 3,7 млн. тон цукровых буракоў, 60 тыс. тон лёну. Таксама Прэзідэнту было далажана аб выніках работы эканомікі Беларусі за першы квартал. Так, тэмп росту ВУП за студзень—сакавік 2008 года да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года склаў 110,5 працэнта. «Гэта добры паказчык. Ён адпавядае ўзроўню развіцця эканомікі ў 2004 годзе», — адзначыў прэм'ер-міністр. Тэмп росту прамысловай вытворчасці Беларусі за 3 месяцы склаў 113,6 працэнта, сельскагаспадарчай — 106,8 працэнта, інвестыцый у асноўны капітал — 120 працэнтаў. Выкананы паказчыкі па ўводу жылля ў эксплуатацыю. Інфляцыя за студзень—сакавік склалася на ўзроўні 4,1 працэнта. У Расіі інфляцыя за гэты перыяд склала 4,8 працэнта, ва Украіне — больш як 9 працэнтаў.

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць правядзення паскоранай мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў, укаранення новых тэхналогій, у тым ліку ў сферы энергазберажэння.

Размова на сустрэчы таксама ішла і аб рэалізацыі дамоўленасцяў, што былі дасягнуты ў ходзе апошняга пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, праведзенага ў сакавіку ў Мінску. У прыватнасці, абмеркаваны пытанні развіцця гандлёва-эканамічных адносінаў з Расійскай Федэрацыяй. У гэтым годзе тэмпы росту ўзаемнага тавараабароту значна вышэйшыя за мінулагоднія. У цэлым аб'ём знешняга гандлю Беларусі таварамі і паслугамі за 2 месяцы 2008 года павялічыўся больш як на 60 працэнтаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**РОЗГАЛАС** апошняя інфармацыя сутак

### ДОЖДЖ, МОЦНЫ ВЕЦЕР І ПЛЮС 22

**На выхадныя ўсталюецца цёплае, але даволі дажджлівае надвор'е, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

У суботу на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень на паўночным захадзе дажджы моцныя. У асобных раёнах навальніцы. Удзень пры навальніцах парывы ветру да 15—20 м/с. Уначы — 7—13, удзень — 14—20 градусаў цяпла.

У нядзелю надвор'е зусім сапсуецца. На ўсёй тэрыторыі краіны чакаецца дождж, месцамі дождж з моцнымі навальніцамі, уначы ў асобных раёнах, а ўдзень амаль паўсюдна парывы ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак — 7—13 градусаў, удзень па паўднёвым усходзе — да плюс 15. У пачатку наступнага тыдня дажджы адступяць, але стане халадней. Тэмпература паветра ўначы — 0—6 цяпла, удзень — 8—15 градусаў. Згодна з папярэднімі прагнозамі, ужо з серады на тэрыторыі Беларусі зноў будзе дажджліва і ветрана. Сіноптыкі не выключаюць, што і гэта хваля дажджоў будзе даволі моцнай.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### СУБОТНІК — АХОВЕ ЗДАРОЎЯ

**19 красавіка рэспубліканскі суботнік адных застане на працоўных месцах, а другіх — на ўладкаванні зонаў масавага адпачынку, дваровых тэрыторый, тратуараў.**

Зароблены ў гэты дзень грошы ў тым памеры, які вызначыць сам працоўны калектыў, добраахвотна будуць пералічаны ў аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам, адкуль палова сродкаў паступіць у Міністэрства фінансаў. Аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам плануюць выкарыстаць атрыманыя сумы на набыццё медыцынскай тэхнікі — ультрагукавыя апараты, рэнтгеналагічнае, лабараторнае і відэаэндаскапічнае абсталяванне, абсталяванне для лячэння неданошаных дзяцей, апараты для рэгістрацыі отаакустычнай эмісіі нованароджаных, а таксама для дзяржаўных арганізацый аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу дзецям. Грошы, пералічаныя на адрас Міністэрства фінансаў, будуць накіраваны на набыццё рэанімабіляў з поўнай камплектацыяй медтэхнікай для Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» і іншых дзяржаўных арганізацый аховы здароўя.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### СПЯШАЛАСЯ І... ТРАПІЛА ПАД ЦЯГНІК

**38-гадовая мінчанка па неасцярожнасці апынулася пад другім вагонам цягніка, які прыбыў на станцыю «Плошча Якуба Коласа» на 1-й лініі метро.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр упраўлення ўнутраных спраў Мінскага метрапалітэна Арцём Гарашэвіч, здарэнне адбылося каля а палове дзесятай раніцы. Жанчына, якая спяшалася на працу, бегла да цягніка, што набліжаўся, заступіла за абмежавальную лінію на прыпынку і паслізнулася. Ды так няўдала, што ўпала на пуці. На шчасце, пасажырка звалілася ў жолаб бяспекі, а машыніст цягніка паспеў прымяніць экстраннае тармажэнне. Адразу ж, каб выключыць няшчасце, было знята і напружанне з кантактнай рэйкі. Пасля таго, як пацярпелую выцягнулі з-пад вагона і ў шокавым стане даставілі ў бальніцу, высветлілася, што яна атрымала чэрапна-мазгавую траўму сярэдняй ступені цяжкасці. Затрымка ў руху цягнікоў на 1-й лініі метрапалітэна склала ўсяго 17 хвілін.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### МАХЛЯРКІ АБАКРАЛІ 84-ГАДОВУЮ ПЕНСІЯНЕРКУ

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, у жыллё да 84-гадовай мінчанкі на вуліцы Фролікава дзве прайдзісветкі трапілі каля а паловы першай дня: яны прадставіліся гаспадыні работнікамі ЖРЭА. Пасля іх візіту пенсіянерка не далічылася 10 мільёнаў 240 тысяч рублёў і сямі залатых ювелірных вырабаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# АСАБЛІВЫЯ ПРЫЧЫНЫ МЕЦЬ ЗАРОБАК

## Маці дзіцяці-інваліда можа абскардзіць адмову ў прыёме на работу ў судзе

**Зніжэнне паказчыкаў смяротнасці сярод немаўлят — гэта, безумоўна, поспех айчыннай медыцыны. Разам з тым нельга не заўважыць: адначасова стала больш вострай праблема дзяцей з адхіленнямі ў здароўі. Статыстыка сведчыць, што цяпер у Беларусі налічваецца 27,6 тыс. дзяцей-інвалідаў, прычым значная іх частка пражывае ў сваіх сем'ях. Між тым, выхаванне дзіцяці з асаблівасцямі развіцця — справа заўсёды няпростая, а таму ў такіх выпадках заканадаўства прадугледжвае бацькам шэраг дадатковых гарантый. Аб гэтых гарантыях — наша гутарка з намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццянай Васільеўнай ШЭМЕТАВЕЦ.**

**ДАПАМОГА З ПАВЫШЭННЕМ**

Перш-наперш варта спыніцца на сацыяльных выплатах. Як нагадвае Таццяна Шэметавец, да дапамог на дзяцей-інвалідаў ва ўзросце як да трох, так і ад 3 да 18 гадоў прадугледжана надбаўка ў памеры 40 працэнтаў. Пры гэтым асобы, што не працуюць і не атрымліваюць пенсіі, могуць адначасова атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў незалежна ад ступені страты яго здароўя ў памеры 65 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

— Апроч таго, у нас існуюць дапамогі пры санаторна-курортным лячэнні дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама варыянты атрымання дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна здзяйсняе догляд, — кажа Таццяна Шэметавец. — Прычым варта заўважыць: дапамогі на дзіця-інваліда выплачваюцца адначасова з пенсіяй.

**ПАМЕР У ЗВЯЗЦЫ СА СТРАТАЙ ЗДАРОЎЯ**

У сваю чаргу пенсія на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў залежыць ад ступені страты здароўя, якую вызначае медыка-рэабілітацыйная экспертная камісія. Пры першай ступені памер такой пенсіі складае 150, другой ступені — 175, трэцяй ступені — 200, чацвёртай — 250 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце, а памер мінімальнай пенсіі па ўзросце на сёння — 50 020 рублёў. Пры гэтым дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў вызначана штомесячная даплата да пенсіі ў памеры 20 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

— Тут жа трэба сказаць і аб пенсійных ільготах для саміх бацькоў, — працягвае Таццяна Шэметавец. — Так, маці, якая выхоўвае дзіця-інваліда на працягу не менш чым 8 гадоў да іх паўналецця і мае не менш чым 20-гадовы стаж, могуць выходзіць на пенсію раней — у 50-гадовым узросце. Раней (у 55-гадовым узросце) у некаторых выпадках можа выходзіць на пенсію і бацька. Аднак неабходныя для гэтага ўмовы — не менш чым 8-гадовы перыяд выхавання дзіцяці да паўналецця, не менш чым 25-гадовы працоўны стаж, а таксама адмова маці скарыстацца сваім правам на датэрміновую пенсію маці на карысць бацькі.

**БЯСПЛАТНЫЯ ПУЦЁЎКІ ЗАСТАЛІСЯ**

«Ільготная» тэма застаецца па-ранейшаму папулярнай, таму спынімся на ёй падрабязней. Дзеці-інваліды (пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці процілапаказанняў) захавалі магчымасці першачарговага і бясплатнага забеспячэння пуцёўкамі на санаторна-курортнае лячэнне ці аздараўленне. Да таго ж таксама бясплатна могуць забяспечвацца пуцёўкамі на санаторна-курортнае лячэнне ці аздараўленне і асобы, што суправаджаюць дзіця з асаблівасцямі развіцця ў здраўніцы, — пры ўмове, што неабходнасць такога суправаджэння пацвярджаецца медыкамі.

— Маюць дзеці-інваліды і шэраг асобных ільгот на праезд, — зазначае Таццяна Шэметавец. — У прыватнасці, незалежна ад месца жыхарства такія дзеці могуць ездзіць бясплатна на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту апроч таксі, а дзеці-інваліды з сельскай мясцовасці — таксама і на міжгароднім аўтатранспарце агульнага карыстання ў межах свайго раёна. І, апроч таго, дзеці-інваліды маюць права на бясплатны праезд на чыгуначным, водным і аўтамабільным транспарце агульнага карыстання прыгарадных зносінаў.

**КАНТРАКТ МАГЧЫМЫ НЕ ЗАЎСЁДЫ**

Наяўнасць дзіцяці-інваліда — гэта дадатковыя цяжкасці з працаўладкаваннем. Таму ў заканадаўстве замацавана норма: грамадзянам, якія маюць на ўтрыманні дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, памер дапамогі па беспрацоўі павялічваецца на 10, а грамадзянам з двума і больш дзецьмі-інвалідамі — на 20 працэнтаў. Будзе нялішняй і такая заўвага. Пры наяўнасці дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў памер стыпендыі бацькам, што накіроўваюцца службай занятасці на навучанне ці перанавучанне прафесіі, складае 75 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты па апошнім месцы працы. Прычым памер такой стыпендыі не можа быць меншым за 1,5 і большым за 3 мінімальнага памеру дапамогі па беспрацоўі для гэтага грамадзяніна.

Што ж непасрэдна да спроб працаўладкавання, то тут трэба памятаць: наймальнік, які адмаўляе ў прыёме на работу жанчыне з дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, абавязаны пісьмова патлумачыць матывы свайго рашэння. А потым гэтую адмову можна абскардзіць у судзе.

Прадугледжвае заканадаўства і пэўныя гарантыі пры звальненні. Жанчыну, якая выхоўвае дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, нельга звольніць па жаданні наймальніка — такое звальненне магчыма толькі ў выпадку ліквідацыі арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка, а таксама ў выпадку «вінаватых» дзеянняў самой работніцы.

І такі даволі цікавы момант. Як адзначае Таццяна Шэметавец, з жанчынамі, якія маюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў і якія занятыя на ўмовах бестэрміновага працоўнага дагавора, не павінны заключацца кантракты. І выключэннем у дадзеным выпадку можа быць хіба што асабістая згода.

**ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА — ЗГОДА**

Жанчыны, якія маюць дзяцей з асаблівасцямі развіцця ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў, могуць прыцягвацца да начных, звышурочных работ, да работы па выхадных і святах, а таксама накіроўвацца ў службовую камандзіроўку зноў-такі толькі з асабістай згоды. І тая ж згода патрабуецца пры складанні графікаў працоўных водпускаў. У прыватнасці, жанчына з непаўнагадовым інвалідам можа планаваць свой адпачынак на летні ці іншы зручны для сябе час, а ў выпадку неабходнасці — і патрабаваць да 14 дзён водпуску без захавання зарплаты.

Нарэшце, нельга не ўзгадаць аб магчымасцях атрымання «лішніх» выхадных. Маці, бацьку ці апекуну, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, можа прадастаўляцца адзін дадатковы свабодны ад работы дзень у месяц з аплатай за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання або адзін дадатковы выхадны ў тыдзень з аплатай па сярэднім заробку. Праўда, заўважае Таццяна Шэметавец, тут давядзецца выбіраць — адначасова атрымаць дадатковы выхадны і ў месяц, і ў тыдзень нельга.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Рознічныя цэны на цэмент павялічаны ў Беларусі з 1 красавіка

**Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Міністэрства эканомікі № 68, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Мінэканомікі.**

Як удакладнілі спецыялісты, рознічныя цэны павышаны ў залежнасці ад маркі і тарыравання цэменту. Напрыклад, кошт партландцэменту 500-Д0 у мяшку ёмістасцю 50 кг павысіўся з Br16350 да Br22530. Цана гэтага ж цэменту ў мяшку 25 кг складае цяпер Br11580 супраць Br8350 да павышэння.

Адначасова для таго, каб не дапусціць рэзкага росту цэн на цэмент на спажывецкім рынку, гандлёвыя скідкі, што прадастаўляюцца арганізацыям рознічнага гандлю, зніжаны з 23 працэнтаў да 17 працэнтаў, для гандлёвых арганізацый спажыўкааперацыі — з 28 працэнтаў да 21 працэнта.

Новыя рознічныя цэны на цэмент у Беларусі ўстаноўлены ў сувязі з павышэннем з 1 красавіка гэтага года адпускных цэнаў на гэты будматэрыял.

Як расказалі БЕЛТА ў Мінбудархітэктуры, адпускныя цэны на цэмент айчыннай вытворчасці павялічаны ў сярэднім на 65—70 працэнтаў. Заводы-вытворцы цяпер цэмент найбольш распаўсюджанай маркі 500-Д0 прадаюць па цане каля Br265 тыс. за тону.

Рост адпускных цэнаў на цэмент адаб'ецца на кошце будаўніча-мантажных работ. Каб гэтыя змяненні не былі істотнымі, Мінбудархітэктуры распрацавала кампенсацыйныя меры. У прыватнасці, цяпер падрыхтаваны і ўнесены на разгляд кіраўніка дзяржавы прапановы аб накіраванні асноўнай часткі дадатковых даходаў, атрыманых вытворцамі цэменту ў выніку росту адпускных цэнаў, у фонд нацыянальнага развіцця. У далейшым гэтыя сродкі плануецца накіраваць на фінансаванне мерапрыемстваў дзяржпраграмы развіцця будаўнічага комплексу Беларусі.

**БЕЛИНВЕСТБАНК**

**СООБЩАЕТ:
21 АПРЕЛЯ 2008 ГОДА
В ПОМЕЩЕНИИ ЦЕНТРАЛЬНОГО БАНКА
ПО АДРЕСУ:
г. Минск, пр-т Машерова, 29, в 11.00
ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ
СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА
В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О размере вознаграждений членам Наблюдательного совета ОАО «Белинвестбанк» за исполнение ими своих обязанностей.

Лица, имеющие право на участие в собрании и желающие принять в нем участие, могут обратиться за получением под роспись бюллетеней для голосования и иной информации по месту нахождения банка (филиала, отделения) до 18 апреля 2008 года.

**Адреса банка и его филиалов в г. Минске и по областям, а также телефоны для справок:**

224030, г. Брест, ул. Советская, 50, тел./факс (8-0162) 23-08-36
210015, г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел./факс (8-0212) 29-75-46
246050, г. Гомель, ул. Советская, 7, тел./факс (8-0232) 74-11-45
230023, г. Гродно, ул. Мицкевича,3, тел./факс (8-0152) 72-02-13
220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (8-017) 289-28-26, 334-45-98
220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел./факс (8-017) 217-30-66
220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел./факс (8-017) 203-93-96
212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел./факс (8-0222) 22-03-35

*Заполненные бюллетени для голосования следует направлять (представлять) в Центральный банк по адресу 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29.*

*Правление ОАО "Белинвестбанк"*

*Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» УНП 807000028.*

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.*

**БПС-БАНК**

*Бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск-5*
*Телефон (8-017) 289-46-06, факс 210-03-42, e-mail: inbox@bpsb.by, Интернет: www.bpsb.by*

### Открытое акционерное общество «Белпромстройбанк»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

**на 1 апреля 2008 года** *(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2008 | На 01.04.2007 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 167164,3 | 100989,8 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 262619,6 | 150842,9 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 350192,3 | 91105,7 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 150190,9 | 0,0 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3,1 | 70493,9 | 50351,1 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3,2 | 129507,5 | 40754,6 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 414880,5 | 248053,8 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 2376977,4 | 1612842,1 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 1624,1 | 1346,1 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 167884,1 | 140994,2 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 32705,7 | 21134,3 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 3774048,0 | 2367308,9 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 65889,8 | 11637,4 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 501210,2 | 239314,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 2669173,5 | 1767912,5 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 28940,0 | 12894,9 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 62984,1 | 26700,5 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3328197,6 | 2058459,9 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 169866,7 | 99878,8 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 29044,8 | 19563,4 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 123628,2 | 80955,3 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 123310,7 | 108451,5 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 445850,4 | 308849,0 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 3774048,0 | 2367308,9 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 2625291,4 | 1424958,7 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 1270386,5 | 678471,2 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ

**на 1 апреля 2008 года** *(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статей | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2008 | На 01.04.2007 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 80115,7 | 53173,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 53241,0 | 29295,9 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 26874,7 | 23877,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 39179,6 | 28265,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 7035,3 | 4057,2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 32144,3 | 24208,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 10654,6 | 7299,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | 12,3 | 10,3 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 0,5 | 0,4 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 122,7 | 3037,3 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 2019,5 | 2171,9 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 42924,1 | 33056,9 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 1444,6 | 1247,9 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 5544,6 | 4244,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 21669,9 | 15980,9 |

**Генеральный директор** **Г.П. Кухоренко**

**Главный бухгалтер** **А.В. Борейко**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.04.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 3 398,00 |
| 1 латвійскі лат | 4 877,77 |
| 1 літоўскі літ | 984,28 |
| 1 чэшская крона | 135,20 |
| 1 польскі злоты | 984,76 |
| 1 расійскі рубель | 91,42 |
| 1 украінская грыўня | 429,56 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў* Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,4628 |
| 10 UAH | 46,6105 |
| 1000 BYR | 10,9333 |
| EUR | 37,1299 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 10.04.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08069>

9771990763008

# ПАНЯДЗЕЛАК, 14 КРАСАВІКА

---

**5.25** «Зоркі кіно». Жак Дорфман.
**6.20, 7.05, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.45, 7.45, 18.50, 0.50** Зона Х.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.30, 8.25** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.30** У свеце матораў.
**9.05** Фігуры.
**9.35** Здароўе.
**10.00** «Жыццё як жыццё». «Што ўтойвае маё дзіця».
**11.00, 17.40 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**12.15 Меладрама «Танцуй...».**
**14.00** «Нябачны фронт».
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.00** Час кіно.
**16.30** Еўрафэст. Дзень за днём.
**16.45 Серыял «Родныя людзі».**
**19.35** Час спорту.
**20.00** «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.45, 0.55 Серыял «Лічбы».**
**22.45 Баявік «Рэвальвер».**

---

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.40** «Ералаш».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 3.20** Навіны спорту.
**11.10** «Вясенні жарт з...».
**12.00** «Малахаў +».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.10** «Гадзіла».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.05 «Дачка садоўніка». Серыял.**
**16.15** «VI Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2008. Магілёўская вобласць».
**18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.**
**18.55** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00 «І ўсё-такі я кахаю...». Серыял. Заключная серыя.**
**23.30** «Злачынствы стагоддзя».
**0.05** «Жыццё з чыстага ліста».
**1.00** «Бразільскі футбол на АНТ».
**3.30—5.00** Тэхнічная прафілактыка.
**5.05** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.

---

**6.45, 14.05** Мультсерыял «Цімон і Пумба».
**7.10** Ранішняя падзарадка.
**8.10, 15.55** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.45** Невытлумачальна, але факт.
**9.35** У гэты дзень.
**9.40, 16.35** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.25** Святло далёкай зоркі. Міхаіл Дзянісаў.
**10.55, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
**11.50** Усё аб бяспецы.
**12.20** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**12.50** Школа рамонту.
**13.45** Тэлебарометр.
**14.30** «Нязнайка вучыцца». Мультфільм.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Нянька спяшаецца на дапамогу.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50 Серыял «Каралі гульні».**
**20.10** Калыханка.
**20.30** Беларуская часінка.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.30** Хакей. Формула гульні.
**23.00 Камедыя «Рускія грошы».**

### ТВ РЕН

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.45** «Вялікае снеданне».
**8.25, 16.50 «Афрамасквіч». Серыял.**
**9.00** «Тыдзень».
**10.00** «Спартыўны тыдзень».
**10.40** «Наш дом».
**11.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**11.10 «Рэбека». Серыял.**
**12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.**
**12.50** «Наша справа»:
**13.00** «Ёсць кантакт».
**13.50** «Народжаныя ў СССР».
**14.30** «Культурнае жыццё».
**15.00 «Элен і сябры». Серыял.**
**15.35** «Уваскрэсенне класікі». Дыялогі аб музыцы.
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Трылер «Трэці лішні».**
**23.00** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**23.10 «Баец». Серыял.**
**0.00** «Закон і крымінал».
**0.05** «Сталічны футбол».
**0.35** «Гучная справа».
**1.25 «Насланнё». Серыял.**
**2.15 Маст. фільм «Вочы анёла».**

---

**5.00, 6.15, 7.00, 1.15** Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Мар, дзейнічай, будзь!»
**8.00, 18.45 Серыял «Прынцэса і жабрак».**
**9.15** «Ведаем рускую».
**10.15** «Дзень Пасла».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30** Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
**12.15** «Студыя 60х90».
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Я цябе помню».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.15** Дак. серыял «Самыя дзіўныя святы свету».
**16.25, 1.40** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.25, 2.30** «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
**18.25** «Акцэнты».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** «Агульны інтарэс».
**20.30** «Рэспубліка сёння».
**20.45** «Суседзі».
**21.25 Серыял «Лабірынт».**

### ВосьМой

**7.00, 10.50, 18.10, 22.55** Навіны кіно.
**7.10** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.25, 21.05, 23.35** «Метэапрагноз».
**7.30 Маст. фільм «Змяіны востраў».**
**8.55** «К-гульні».
**9.00** «Клуб-700».
**9.30** «К-відэа для дзяцей».
**9.50** Дак. фільм.
**11.00 Маст. фільм «Адзін цудоўны дзень».**
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**16.30** «Мультпарад».
**16.40** «Фантастыка і прыгоды». «Дзве цвярдыні»
**18.20 Серыял «Амазонія».**
**19.10** «Мой любімы гадаванец».
**19.25, 21.10** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**21.15 Трылер «Пачвара з Жэвадана».**
**23.05 Серыял «Духі продкаў».**

### РОССИЯ

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.05** «Радавое праклянцце Гандзі».
**10.00** «Рэвізор».
**10.30** «Спецыяльны карэспандэнт».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 14.20, 19.25** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.45** «Кнот».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
**13.50, 16.50, 18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**14.20 Камедыя «Сябры жаніха».**
**15.55 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
**17.50 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**19.45 Серыял «Казус Кукоцкага».**
**20.50** Добрай ночы, малыя!
**21.05 Серыял «Целаахоўнік».**
**22.05 Серыял «Вайна ў доме».**
**23.10** «Весткі+».
**23.30** «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

### РТР ПЛАНЕТА

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**10.00, 17.25, 0.25 «Гонка за шчасцем». Серыял.**
**10.45, 18.15, 1.10 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**11.30** Мультфільмы.
**11.45 Маст. фільм «Урокі ў канцы вясны».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Маст. фільм «Сістэма «Ніпель».**
**15.15** «Скаваныя адным ланцугом. Сіняўскі і Даніэль».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі—спорт.
**16.55, 5.40** «Пра арт».
**19.45, 1.55 Серыял «Мачаха».**
**20.30, 3.45 Серыял «Бухта прапаўшых дайвераў».**
**21.15, 4.50** «Мой сярэбраны шар. Таццяна Пельтцар».
**22.00** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**22.20** «Астравы». Міхаіл Кузняцоў.
**23.00, 4.30** «Весткі+».
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

### НТВ

**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00** Сёння.
**9.00** «Агляд».
**9.30** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.15** «Следства вялі...»
**13.30 Серыял «Адвакат».**
**15.10** «Прафесія — рэпарцёр».
**15.30, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25 Камедыя «Эйс Вентура-2: Калі кліча прырода».**
**18.10** «Асарці».
**19.45 Серыял «Малады ваўкадаў».**
**20.50 Серыял «Ліцейны, 4».**
**22.30 Серыял «Марскія д'яблы-2».**
**23.30 Серыял «Стаўка на жыццё».**

### ЦЕНТР

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30** Падзеі.
**7.45, 10.15, 0.05** Пятроўка, 38.
**7.55, 13.45, 18.50** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**8.05 «Калі ты маеш рацыю...». Маст. фільм.**
**9.45** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Воўчая зграя».
**10.45** «Пастскрыптум».
**11.55** «Доказы віны». «Спрут».
**12.45** Лінія абароны.
**13.50, 4.40** Мультфільмы.
**14.30** «У цэнтры падзей».
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.15** Алёна Хмяльніцкая ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
**17.45 «Служба 21, або Думаць трэба пазітыўна». Серыял.**
**18.55** Маскоўскі тыдзень.
**20.00 «Справа была ў Гаўрылаўцы-2». Серыял.**
**20.55 «Малады ваўкадаў». Серыял.**
**21.55** Момант ісціны.
**22.45** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.15** «Нічога асабістага». Закон і мы.
**0.25 «Чыста англійскае забойства». Серыял.**
**2.00 «Па вуліцах камоду вадзілі». Маст. фільм.**
**3.05** Маст. фільм.

### EUROSPORT

**9.30** Мотаспорт па выхадных.
**10.00** Мотагонкі. Гран-пры Партугаліі.
**11.00** Марафон. Лондан.
**12.00, 17.00** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
**14.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі.
**16.00** Велагонка. Парыж — Рубе.
**18.15** «На шляху да «Ралан Гарос».
**18.30** Футбол. «Еўра-2008».
**19.00, 1.00** Футбол. Еўрагалы.
**19.45** Вось гэта дзіва!!!
**20.00** «Вікінг».
**21.00, 1.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**22.30** Байцоўскі клуб.

## 22.45 ФІЛЬМ ДНЯ

### «РЭВАЛЬВЕР» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ФРАНЦЫЯ, 2005 г.)



Джэйк Грын — удачлівы азартны ігрок. Але аднойчы ён выйграе ў боса ўсё, што можа, а ў дадатак яшчэ і зневажае прайграўшага. З гэтага часу стаўка большая, чым жыццё, і тут якраз і пачынаецца ўсё самае захапляльнае і таямнічае.

**Рэжысёр** — Гай Рычы. **У ролях:** Рэй Ліёта, Джэйсан Стэтэм, Вінсент Пасторэ.

# АЎТОРАК, 15 КРАСАВІКА

---

**5.30 Серыял «Прымадонна».**
**6.20, 7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.30, 7.05** Прэс-агляд.
**6.45, 7.45, 18.50, 0.40** Зона Х.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.35** Час спорту.
**9.05 Дэтэктыў «Бухта страху».**
**10.05, 16.50 Серыял «Родныя людзі».**
**11.00, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**12.10 Меладрама «Душачка».**
**13.35** Час кіно.
**14.00** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.45** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30, 1.00 Серыял «Вось так!»**
**15.55 Серыял «Фаворскі». 1-я серыя.**
**19.35** Сфера інтарэсаў.
**19.55 Серыял «Бухта страху».**
**21.00** Панарама.
**21.45, 1.25 Серыял «Лічбы».**
**22.40 Камедыя «Здзелка».**
**0.50** Дзень спорту.

---

**9.05—15.00** Тэхнічная прафілактыка ў Смятанічах, Гродне.
**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Чакай мяне.
**10.00** «Модны прыгавор».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35, 3.20** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.10** «Гадзіла».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.05 «Дачка садоўніка». Серыял.**
**16.15 «Агонь кахання». Серыял.**
**17.10, 5.05** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
**18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.**
**18.55 «Таццянін дзень». Серыял.**
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Апостал».**
**22.15 Серыял «Выклік-2».**
**23.40** «Аднапавярховая Амерыка».
**0.40 Маст. фільм «Сталкер».**
**3.45 «Каварства гор». Серыял.**
**4.35 «Маё жыццё і я». Серыял.**

---

**6.45, 14.20** Мультсерыял «Цімон і Пумба».
**7.10** Ранішняя падзарадка.
**8.10, 16.00** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.45, 18.50 Серыял «Каралі гульні».**
**9.45** У гэты дзень.
**9.50, 16.35** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.40** Хакей. Формула гульні.
**11.10, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
**12.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.05** Школа рамонту.
**14.00** ПРАсоўванне+.
**14.40** «Як стары квактухай стаў». Мультфільм.
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**18.35** Навіны культуры.
**20.05** Калыханка.
**20.25** Беларуская часінка.
**21.30** Спорт-кадр.
**22.00** «Іншыя». Вяршыня айсберга. Гёрллайверы.
**22.35 Серыял «Непрыгожая Бэці».**
**23.35** Хакей. НХЛ. Плей-оф. Матч тыдня.

### ТВ РЕН

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30, 16.50 «Афрамасквіч». Серыял.**
**9.00** «Прачніся і спявай».
**9.30** «Лінія лёсу»:
**10.00** «Сталічны футбол».
**10.40** «Далёкія сваякі».
**11.00, 15.30, 23.00** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**11.10 «Рэбека». Серыял.**
**12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.**
**12.50** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**13.00** «Сталкер».
**13.50** «Прафесійны бокс».
**14.40** «Гаргуллі». Мультсерыял.
**15.00 «Элен і сябры». Серыял.**
**15.40** «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Расследаванні».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55 «Салдаты 14». Серыял.**
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.10 «Баец». Серыял.**
**0.00** «Закон і крымінал».
**0.05** «Гарачы лёд».
**0.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**1.25 «Насланнё». Серыял.**

---

**5.00, 6.15, 7.00, 1.00** Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
**6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**6.45** Камерцыйная праграма.
**7.30** «Рэспубліка сёння».
**8.00, 18.45 Серыял «Прынцэса і жабрак».**
**9.15** «Хіт-экспрэс».
**10.15** «Суседзі».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
**11.30** «Пра каханне». Гвоздзікава — Жарыкаў.
**12.15** «Студыя 60х90».
**12.25, 22.25 Маст. фільм «Дакрананне».**
**14.15** «Вучым англійскую».
**15.25, 0.05** Дак. серыял «Вы гэта бачылі?»
**16.25, 1.30** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.25, 2.30** «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
**18.25** «Акцэнты».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** «Спрэчная тэрыторыя».
**21.25 Серыял «Лабірынт».**

### ВосьМой

**7.00, 18.15, 19.10** «К-гульні».
**7.10, 10.55, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.15 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем у рай».**
**8.50, 19.30, 22.50** «Навіны кіно».
**9.00** «Клуб 700».
**9.30** «Зялёны дом».
**9.45** Дак. фільм.
**10.50** Інфармбюро «Міжнароднае».
**11.00 Маст. фільм «Пачвара з Жэвадана».**
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**16.30** Мультпарад.
**17.00** «Фантастыка і прыгоды». «Вяртанне».
**18.20 Серыял «Амазонія».**
**19.15** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**19.40, 21.15** «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.45 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Зялёны дом».
**21.20 Камедыя «Анёл А».**
**23.00 Серыял «Духі продкаў».**

### РОССИЯ

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.00** «Астралогія. Ахвяры зорнай хлусні».
**9.50, 19.45 Серыял «Казус Кукоцкага».**
**10.45** Весткі. Дзяжурная часць.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 14.20, 19.25** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.45, 21.05 Серыял «Целаахоўнік».**
**12.35** «У Гарадку».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
**13.50, 16.50, 18.50, 23.00** Весткі—Беларусь.
**14.30 «Кулагін і партнёры».**
**15.00** Суд ідзе.
**15.55 Серыял «Рамэо і Джульета».**
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
**17.50 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**20.50** Добрай ночы, малыя!
**22.05 Серыял «Вайна ў доме».**
**23.10** Весткі+.
**23.30** «Нішто не вечнае... Юрый Нагібін».

### РТР ПЛАНЕТА

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**10.00, 17.25, 0.25 «Гонка за шчасцем». Серыял.**
**10.45, 18.15, 1.10 «Жанчына без мінулага». Серыял.**
**11.30** «Астравы». Міхаіл Кузняцоў.
**12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Бухта прапаўшых дайвераў».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Камедыя «Дзівакі».**
**14.50** Мультфільмы.
**15.15** «Спартак Мішулін. Які ўмее лятаць».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі—спорт.
**16.55, 5.40** «Легенды сусветнага кіно». Ісак Дунаеўскі.
**19.45, 1.55 Серыял «Мачаха».**
**21.15, 4.50** «Як адзін лейтэнант вайну спыніў».
**22.00** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**22.20** «Апокрыф».
**23.00, 4.30** « Весткі+».
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

### НТВ

**6.00** «Сёння раніцай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00** Сёння.
**9.00, 20.50 Серыял «Ліцейны, 4».**
**9.50, 15.20** «Асарці».
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote».
**11.20 Серыял «Жыццё і смерць Лёнькі Панцялеева».**
**13.35 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».**
**15.30, 18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25 Серыял «Плюс бясконцасць».**
**19.45 Серыял «Малады ваўкадаў».**
**22.30 Серыял «Марскія д'яблы-2».**
**23.30 Серыял «Стаўка на жыццё».**

### ЦЕНТР

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.50** Падзеі.
**7.45, 10.15, 2.20** Пятроўка, 38.
**7.55 Ала Пугачова ў фільме «Жанчына, якая спявае».**
**9.35** «Доказы віны». «Казахстанскі транзіт».
**10.50, 20.05 «Справа была ў Гаўрылаўцы-2». Серыял.**
**11.45, 21.00 «Малады ваўкадаў». Серыял.**
**12.40** Момант ісціны.
**13.45** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**13.50** Нашы любімыя жывёлы.
**14.30 «Закон Вольфа». Серыял.**
**15.30** Новая «Часінка».
**16.55** Дзелавая Масква.
**17.15** «21 кабінет».
**17.45 «Служба 21, або Думаць трэба пазітыўна». Серыял.**
**18.55** Тварам да горада.
**21.55** «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Дам хабар у добрыя рукі».
**22.50** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.20** Ала Пугачова ў дакументальным фільме «Казкі пра каханне».
**23.55 Маст. фільм.**
**2.35 «Саўдзел у забойстве». Маст. фільм.**
**4.35** Мультпарад.

### EUROSPORT

**9.30** Футбол. Еўра-2008.
**10.00, 13.30** «На шляху да «Ралан Гарос».
**10.15, 16.00, 19.15, 21.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**11.45** Велагонка. Парыж — Рубе.
**12.45, 19.00, 20.00, 20.45** Футбол. Еўрагалы.
**13.45** Снукер. Мастэрс.
**23.00** Бокс.
**1.00—9.30** Увага!!! Прафілактыка.

## 0.40 ФІЛЬМ ДНЯ

### «СТАЛКЕР» (СССР, 1979 г.)

Сталкер — чалавек, які валодае прафесійнымі ведамі сістэмы перашкод і пастак Зоны, куды можна прыйсці, калі не засталося ніякай веры. Тут здзяйсняюцца запаветныя жаданні — патаемныя, шчырыя, выпакутаваныя.



**Рэжысёр** — Андрэй Таркоўскі. **У ролях:** Аляксандр Кайдаплоўскі, Аліса Фрэйндліх, Анатоль Саланіцын, Мікалай Грынько.

# СЕРАДА, 16 КРАСАВІКА

---

**5.30, 15.55 Серыял «Фаворскі».**
**6.20, 7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.30, 7.05** Прэс-агляд.
**6.45, 7.45, 18.50, 0.35** Зона Х.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.30** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам!
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.05, 19.55 Серыял «Бухта страсці».**
**10.00, 16.50 Серыял «Родныя людзі».**
**11.00, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**12.10 Маст. фільм «Чучала». 1-я серыя.**
**13.45** «Нябачны фронт».
**14.00** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**14.45** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30, 0.55 Серыял «Вось так!».**
**19.35** Зямельнае пытанне.
**21.00** Панарама.
**21.45, 1.20 Серыял «Лічбы».**
**22.40 Меладрама «Ідэальнае злачынства».**
**0.45** Дзень спорту.

---

**9.05—15.00** Тэхнічная прафілактыка ў Шаркоўшчыне, Мазыры, Калодзішчах, Касцюковічах.
**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 3.00, 5.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05, 18.55 Серыял «Таццянін дзень».**
**10.00** «Модны прыгавор».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35, 3.20** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Рабяты з нашага горада».**
**12.00** «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.10** «Гадзіла».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.05 Серыял «Дачка садоўніка».**
**16.15 Серыял «Агонь кахання».**
**17.10, 5.05** «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
**18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Апостал».**
**22.15 Серыял «Выклік-2».**
**23.40** «Тэорыя неверагоднасці».
**0.30** Прафесійны бокс. Лепшыя баі.
**1.30 Дэтэктыў «Гульня ў смерць».**
**3.25 Серыял «Каварства гор».**
**4.15 Серыял «Маё жыццё і я».**

---

**6.45, 13.55** Мультсерыял «Цімон і Пумба».
**7.10** «Ранішняя падзарадка».
